# Колешко
# Елена Ивановна

**Почетный гражданин г. Старые Дороги**
**в документах Слуцкого зонального архива**



ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.107.Л.6

1

АВТОБИОГРАФИЯ

Я,Колешко Елена Ивановна,родилась 20 марта 1930 года в деревне Подлесье,Слуцкого района,Минской области.

До войны закончила 4 класса.

В 1944 году на семейном совете решили,что я должна идти продолжать учиться и одновременно работать.Так до сентября 1950 года работала почтальоном в колхозе.

С 09.1950 г. по 08.1952 г. я училась в Бобруйском учительском институте.После окончания была направлена на 2-х месячные курсы в Минский пединститут.

С 08.1952 г. по 09. 1956 г. работала учительницей Селецкой средней школы Гресского района,Минской области.

Работая в школе,в 1954 году поступила заочно в Минский педагогический институт,который закончила в 1958 году.

С сентября 1956 года меня назначили завучем Селецкой школы. В то же время ликвидировали Гресский район,и Селецкая школа,вместе с территорией сельсовета,оказалась в Пуховичском районе.

С августа 1959 года я уже работала директором этой же школы.

В 1957 году меня приняли в ряды КПСС.Избиралась депутатом Селецкого сельсовета,Пуховичского районного Совета народных депутатов.

В 60-е годы начались хрущёвские реформы.Ликвидировали райкомы партии,а управления сельского хозяйства стали основным руководящим звеном.При них были созданы парткомы с соответствующими отделами.Моя просьба отпустить вновь в школу не была удовлетворена,и меня с II.1959 г. по 08. 1966 г. направляли то на одну,то на другую должность: зав.отделом,инструктор,лектор, зам. председателя райисполкома.

Вновь образовался Стародорожский район,и меня,в числе других будущих руководителей района,направили в г.Старые Дороги,как члена оргкомитета.

С августа 1966 года я была назначена на должность секретаря райкома партии Стародорожского района Минской области.

С августа 1969 года по ноябрь 1983 года я работала вторым секретарём райкома партии Стародорожского района.

2

С II.1983 г. по 10.1986 г. - председатель РК профсоюза работников просвещения райисполкома.

С 02.1987 г. по 08.1992 г. - ответственный секретарь общества охраны памятников истории и культуры,райисполком.

С 08.1992 г. по 09.1998 г. - инспектор отдела культуры.

За трудовые заслуги награждена медалями "За трудовое отличие", "Ветеран труда","За доблестный труд в ознаменование 100-летия со дня рождения В.И.Ленина"; орденом "Знак почета"; Почетной Грамотой Президиума Верховного Совета БССР и Почетной Грамотой Верховного Совета БССР.

Недавно решением райисполкома удостоена звания "Почетный гражданин г.Старые Дороги".

Муж,Кириченко Владимир Павлович,работал военкомом в Стародорожском военкомате.

Родители: мать,Колешко Суклета Васильевна,отец,Колешко Иван Николаевич,родом из крестьянских семей.В 30-е годы отец был репрессирован.Погиб в г.Канибадаме в 1945 г.,не дожив до победы 4 дня. Реабилитирован посмертно в 1961 году.Мать умерла в 1996 году.

В настоящее время нахожусь на пенсии.

16.05.2000 г. Е.И.Колешко

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.101.Л.1-2

# Воспоминания
# Елены Ивановны
## о наиболее запомнившихся событиях жизни, написанные в 90-е годы

Дарога праз семдзесят гадоў

1

Дзяцінства, апаленае вайною.

Нарадзілася 20 сакавіка 1930 г. у в. Падлессе Слуцкага раёна Ленінскага с/савета. Вёска наша вялікая, каля 400-т хат і часцей за ўсё яе звалі сяло. Чаму Падлессе? Цікава, сапраўды.

У часы Сталыпіншчыны, нарэзанне новых зямельных палос, сялянам даводзілася высякаць лес, выкапваць яго карані і атрымліваць зямельныя надзелы зямлі, якая была пад лесам. Таму і назва вёскі „Падлессе".

Даўным-даўно няма тых лясоў у нашых мясцінах. З гадоў свайго дзяцінства добра памятаю, як мы хадзілі на поле, прырэчныя сенажаці і збіралі абпаленыя ці паўзнейшыя карэнні для дроў. Іх было вельмі шмат. Часам сустракаліся такія бярвенні, што нам і не пад сілу былі.

Непадалёку ад вёскі праходзіў Екацярынінскі гасцінец (зараз заасфальтаваная дарога) Масква – Варшава. Гісторыя сведчыць, што ў свой час па ім у кандалах вялі Т. Р. Шаўчэнку.

-2-

Абапал гасцінца расці пасаджаныя па загаду імператрыцы, бярозы. Раннай вясной мы бегалі да іх за сокам, летам і восенню – за грыбамі (абабкі, апенькі, валнушкі і інш.)

У час вайны па загаду нямецка-фашысцкіх захопнікаў усе бярозы былі знішчаны, паколькі на іх дрэву, яны садзейнічалі партызанам пры мініраванні дарогі.

У сям'і нас было чацвёра: брат і яшчэ 2 сястры. Адна неўзабаве памерла. Дзяцінства было як і ў іншых аднагодкаў: раскулачванне, вышук ворагаў народа і г. д.

Першы раз бацьку арыштавалі і выслалі, як кулака, не выканаўшага цвёрдага задання (яно было непасільным наўмысна) у 1932 г. на будаўніцтва канала Масква – Волга. На гэты раз адпусцілі датэрмінова ў 1935 г. Мы ж за гэты час былі выселены на хутар у паўзнішчаную хату без пола і сяней тагачаснага „актывіста", а ён пасяліўся ў нашу са сваёй сям'ёй. Нас там жыло аж 3 сям'і такіх-жа „кулакоў".

У 1939 г. пасля пастановы аб ссяленні з хутароў на трактарных санях гэту хаціну прыцягнулі ў вёску, дзе давялося будавацца і зноў жа без бацькі, бо ў 1937 г. яго па ложнаму даносу тых-жа асоб „актывістаў"

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.104.Л.1-2




Колешко Елена Ивановна
с учителями Селецкой средней школы
1954 г.
ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.107.Л.1

3-

арыштавалі, як ворага народа з высылкай у Сібір на 10 гадоў. Там працаваў на лесапавале у Омскай і Томскай абласцях, лячыўся ў шпіталі пасля пералома бедра ў Бійску. Загінуў у 1945 г. у Таджыкістане г. Ханібадам забяспечваючы тыл Арміі і 4 дні не дажыў да перамогі.

Да вайны скончыла 4 класы. Што запомнілася: 1-ы раз у першы клас мяне адправілі дамоў бо не было 8-і год, пасля, праўда, прынялі, я вельмі страшна плакала праз гэта. Пасля, як выдатніца вучобы, была накіравана ў піянерскі лагер, Уражанне гэта захавалася і на сённяшні дзень.

Маімі кіраўнікамі ў выбары жыццёвай дарогі, прафесіі, выхаванні сілы волі і ўсяго лепшага, што ў мяне ёсць, сталі настаўнікі Бекіш Вольга Якаўлеўна і Шаклевіч Піліп Іванавіч (загінуў на фронце). Дзякуючы ім, я абрала прафесію настаўніцы.

Вайна... –

Урэзалася ў памяць на ўсё жыццё. Страшэнны гул самалётаў фашысцкай авіяцыі, што бамбілі чыгуначныя і дарожныя масты, ваенны гарадкі ў Слуцку... Прыход фашыстаў і абход па дварах з патрабаваннямі „шнап-

-4-

су, сала, яек, курэй", каця першыя яшчэ давалі часта ў замен сахарын, мыла, ці брыкецік соі. Пасля самавольнае выграбанне ўсяго, што маглі знайсці.

Людзей зганялі рамантаваць дарогі, што самі ж разбурылі, і іншыя работы.
У першыя дні такой работы пры ўзрыве снарада быў цяжка паранены брат, шт вез скрыню з пяском, якая, праўда выратавала яго жыццё, аслабіўшы сілу асколка. Аднак асколак трапіў пад лёгкія і рана была адкрытай да аперацыі пасля вызвалення Мінска ад фашысцкіх захопнікаў.

„Старэйшага" ў сям'і давялося быць мне. Акрамя працы на зямельным участку, якім надзялілі па загаду новай улады, застаўлялі на чарзе, 2 разы ў тыдзень хадзіць баранаваць гасцінец ад партызанскіх мін. Але ж партызаны ведалі аб гэтым і міны закладвалі глыбей, чым даставаў зуб бараны. Тады паліцаи пад камандай фашыста загадвалі лажыцца на барану цяжкія камені. Аднак праезджалі баранавальнікі, а фашысцкія машыны пасля нас падрываліся. Пасля нас

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.104.Л.3-4



Елена Ивановна
с подругами
г. Слуцк, 1956 г.
ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.107.Л.2

- 5 - 3

застаўлялі грузіць у скрыні шлак і [illegible] што было сілы. Так доўга не вытрымлівалі коні, якіх страшэнна білі паліцаі, а разам з імі і нас. Былі моманты, калі ў адчаі не хацелася жыць.

Крыху змяніліся абставіны пазней, калі маміны сёстры пайшлі ў партызаны і мама стала прыносіць ад іх воўну ці ніткі, не кажучы нам што і да чаго, бацькам на базары ў Слуцку купляла. Мы ж дома з сястрой суткамі ў асенне-зімовы час вязалі рукавіцы з 2-ма пальцамі і шкарпэткі, якія мама потым адносіла бацькам „на базар прадаваць" і „купляла" соль, муку ці сахарын. Адным словам без дзяцінства сталі дарослымі не па ўзросту.

Я колькі жаху нацярпелася, калі двойчы восенню і зімой ўсю моладзь і падросткаў зганялі ны „выган", што ў цэнтры сяла і адбіралі, хто ім прыглянуўся для адпраўкі ў Германію. Мяне абмінула такі ўдзел, бо я была страшэнна худая, нібы той кнут, якім немец размахваў.

- 6 -

Жаданне выжыць патрабавала неймаверна цяжкай працы. Рана навучылася араць і сеяць не адзін раз паліваючы горкімі слязьмі баразны; жаць і касіць, ездзіць у лес і секчы галлё аж за 18 км. у Капыльскі раён. Бліжэй лесу не было.

У вось... Дзень вызвалення

Увесь дзень і ноч білі „Кацюшы" з боку Бабруйска ў бок Баранавіч. Мы выкапалі яму, назвалі яго „дот", зверху паклалі дошкі і насыпалі зямлі. Да позняй ночы заставаліся наверсе ў садзе, а на ноч па чарзе залазілі ў яму, каб крыху паспаць.

Раніцай у вёсцы з'явіліся першыя грузавікі з нашымі салдатамі. Мы імдавалі што было: малако, самагон, кветкі, яны нам — драбкі цукру, ці хлебныя сухарыкі. Усе плакалі ад радасці. Нашы наступалі так хутка, што фашысты замацаваўшыяся вакол Слуцка, не паспелі адступіць і вымушаны былі хавацца ў балотах ці збажыне. Па начах яшчэ тыдні 2 яны прыходзілі ў вёскі прасілі есці, дзе іх часцей за ўсё і забіралі пастаўленыя патрулі.

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.104.Л.5-6



Заместитель председателя Пуховичского райисполкома Колешко Е.Н. встречает румынскую делегацию в СШ №2 Марьина Горка
1964 г.
ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.107.Л.3

г.



-7- 4

Пасляваеннае жыццё.

Мне ўжо было 14. Я адразу ж пайшла пра-
цаваць калгасным паштальёнам. Брата,
кацяя і хворага, але ён быў самы пісьменны
на вёсцы (7 класаў адукацыі) прызначылі
бухгалтарам калгаса, які тут-жа пачаў
дзяўляцца. А калі прыйшоў верасень —
на сямейным савеце вырашылі што мы
з сястрой павінны ісці ў школу і праца-
ваць. Паштовае аддзяленне было та-
ма жа, дзе і сярэдняя школа, за 5 км
у мястэчку Леніна (Раманава). Так і
сталі жыць і працаваць і вучыцца. Тая-
гады вядома было мала. Цяжка было ін-
шае. Вайна ішла а разам з ей і паштоў-
кі аб загінуўшых родных і блізкіх. У гэта
патрэбна было несці ў хату маці, жонцы,
што чакалі сыноў, гаспадароў ці нако-
нык.

За сваю працу я атрымлівала 0,75 пра-
цадня ў калгасе і 7руб. 20 на пошце. Які-ні-
які, а ўсё ж-такі заробак.

Сястра скончыла школу у 1949 г., а
я ў 1950. Яна паступіла у БДУ
а я у настаўніцкі Бабруйскі інстыту[т]

-8-

Патрэбна было хутчэй ісці працаваць.
З дому мне не было чым дапамагчы.
Стыпендыя мая 90руб., мінус узносы, зап-
лата за інтэрнат, дробныя расходы..
На пражыццё заставалася мала, калі
улічыць што 1 пуд (16кг) бульбы каштаваў
45руб. Можна было і не купляць, але ж хлеб
тады быў па картках (300 г на чалавека).
Вось і даводзілася хадзіць у заработкі да
мясцовых жыхароў: Рабілі ўсё: капалі і са-
дзілі агароды, убіралі бульбу, выбівалі з раз-
валін цэглу, прыбіралі ў дамах і надва-
ры.

У вось дзяржаўныя экзамены. Як здаць.
Кружыцца галава. Урачы вызначылі...
мігрэнь. Узмацніць харчаванне, віта-
міны. Але аб якіх вітамінах можна
думаць, калі хочацца есці. Не-не, ды і пры-
помняцца дамашнія „пышкі", што
пяклі з сабранай мінулагодняй пера-
мерзшай і высахшай бульбы...

Аднак і гэта вытрымала. Экзамены
здадзены на выдатна. Здавалася б радуйся
і адпачывай. Ды к не. Лёс распарадзіўся
інакш. У ліку 4-х такіх выдатнікаў

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.104.Л.7-8



Заместитель председателя райисполкома
Колешко Е.Н.
1965 г.
ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.107.Л.4

- 9 - 5

накіроўваюць у Мінск на курсы на 2 м-цы
для ~~рас~~ падрыхтоўкі на работу ў старэй-
шых класах. Атрымала стыпендыю
і паехала першы раз у Мінск.
Чым ён адрозніваўся ад Бабруйска?
Тым, што болей было аўтобусаў і трам-
ваеў, завалаў з разбітых дамоў на ву-
ліцах і акілетаў неразабраных дамоў.
Лета, спякота. Пяшком з Чырвонаар-
мейскай раніцай к 8-мі на заняткі і
ў 17-18 пяшком з заняткаў. І вось 20-е
жніўня. Скончаны заняткі, здадзены залі-
кі і экзамены, у руках (сумачак яшчэ не было
у мяне)
дакумент і дамоў.

Я – настаўніца

У Грэск прыехала у РАНА, куды была
накіравана на працу, і тут чакалі
непрыемнасці. Хто скончыў на „здаваль-
няюча", той усцеў пабыць ў раёне і
атрымаць накіраванне ў лепшыя ме-
сцы, а я і матэматык паехала з
Бабруйскага (мы разам на курсах былі)
прыбылі за дзень да раённай канфе-
рэнцыі.
Загадчыца РАНА на ўручыла

- 10 - 6

ужо падрыхтаванае накіраванне
і сказала, што гэта Селецкая сярэдняя
школа, там маладыя і даволі вялікі
настаўніцкі калектыў, заўсёды туды
можна даехаць, шмат машын ходзіць
патрэбна толькі выйсці ці выехаць
у Шоўчыцы і адтуль – 24 км да Селец-
ка. Мая Марыя Беразоўская (матэма-
тык) паехала у Глуск дамоў, а я –
з клуначкам, дзе быў кавалак хлеба
і невялікі кусочак дамашняга сыру,
пайшла на папутную машыну.
Мне адступаць няма куды, трэба ехаць
у школу. Дабралася я толькі у 10 гадзін
вечара.
Усе райскія абяцанні загадчыцы РАНА
аказаліся казкай на белага бычка.
Але я з дзяцінства не ўмела пярэчыць
ці шукаць лепшае, дзе яно? Яно ж у тым
каб выконваць што ад цябе патрабу-
ецца. Та з 25 жніўня 1952 г. я стала нас-
таўніцай Селецкай СШ. Якія прадметы
я вяла? Усе. Свайх мовы і літаратуры
было можа 10 гадзін толькі у старэй-

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.104.Л.9-10




Вручение новых партийных билетов
г. Старые Дороги
1973 г.
ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.107.Л.5

- 11 -

шых класах, апошнія гадамі вялі старажылы яны і вязу іх забралі.
Мне аддалі аж 36 гадзін у тыдзень: нямецкая мова, новая гісторыя, логіка і псіхалогія, анатомія і асновы дарвінізма. Нават слёзы не дапамаглі. Праца у дзве змены, ноч на падрыхтоўку. Як жыць? Параілі ~~да~~ на кватэру з харчаваннем гаспадароў, таму што у магазіне нават хлеба няма, трэба хадзіць у суседні раён Старадарожскі у шчыткавіцкі леспрамгасаўскі магазін. Там калі-ні-калі прадаюць хлеб сельскім настаўнікам.
Нам жа давалі ў магазіне сваім па 10 кг. ржаной мукі на месяц. Пячы хлеб сам. Гэта я ўжо умела і вырашылася праблема з хлебам. Усе астатнія на чарзе ездзілі то ў Мінск, у раён, у Слуцк і прывозілі адзін другому. Прыехала ужо знаёмая матэматык М. Беразоўская і жыццё пайшло далей.
Амаль праз 4-ы гады мяне прызначылі завучам гэтай жа школы, са снежня 1956 г. Грэскі раён быў ліквідаваны

- 12 -

і наша тэрыторыя Сялецкага с/с, у тым ліку і школа, апынулася ў Пухавіцкім раёне, дзе я працавала завучам пасля ~~з 1959~~ дырэктарам гэтай жа Сялецкай школы.
У 1957 г. была прынята ў рады камуністычнай партыі. Выбіралася дэпутатам Сялецкага с/с, Пухавіцкага раённага Савета народных дэпутатаў, сакратаром камсамольскай арганізацыі калгаса імя Свярдлова, намеснікам сакратара першаснай, пасля тэрытарыяльнай партыйнай арганізацыі.
Асноўнымі цяжкасцямі першых гадоў працы ў школе, апрача бытавых, была адсутнасць вопыту работы ў школе. Вучні ў асноўным у старэйшых класах былі пераросткі, паколькі сярэдняя школа была за 12 км, а 9-ы кл. адкрылася толькі ў год нашага прыезду. Былі нават старэйшыя за прыехаўшых настаўніц. Свой першы выпуск у 1954 г. я памятала увесь час. Гэта быў і 1-шы выпуск Сялецкай СШ.

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.104.Л.11-12



Делегация Советского фонда мира из БССР
в г. Будапеште
1979 г.
ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.107.Л.7



-13-

Праца ў школе мне вельмі падабалася. Я аддавала сябе ўсю ей без астатка і не ведала, што гэты я рых тую для сябе новыя выпрабаванні. Але ж хоць бы і ведала, не змагла б інакш. Ў хутка мне давялося растацца са школай. Толькі зрабілі капітальны рамонт, пасадзілі сад, куды шмат чаго прывязла з роднай Случчыны; гаспадар кватэры дазволіў пакапаць маладых ліп і мы пасадзілі вясной 2-е ліпавых алеі ў двары школы, а восенню гэтага ж 1959 г. мяне забралі на работу ў Бухавіцкі РККПБ загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі.

Усё гэта карэнным чынам памяняла мой лёс, мае планы, маё жыццё. Партыйна-савецкая работа забрала нервы і сілы, настаўніцкую любімую работу і школу.

60-я гады – Хрушчоўскія перабудовы, калі ліквідуюцца райкомы партыі, упраўленні сельскай гаспадаркі

-14- 8

становяцца асноўным кіруючым звяном. Пры іх ствараюцца парткомы з адпаведнымі аддзеламі.

Мая просьба адпусціць зноў у школу не была ~~удовлетворе~~ задаволена і я разам з гісторыяй краіны, народа перабіралася з адной хвалі ў другую. Загадчык аддзела, інструктар, лектар, намеснік старшыні райвыканкама.

Зноў партыйная работа
Старадарожскі раён.

Жнівень-1966 год. У мяне адпачынак з лігення. Зрабіла рамонт у кватэры і паехала на родную Случчыну на адпачынам. Раптам прыязджае сакратар Слуцкага РККПБ да нас дамоў і дае чытаць тэлеграму з Мінскага абкома партыі. Сэрца абарвалася ў прадчуванні змен, яно мяне не падводзіла. Вельмі балюча было пакідаць мне, а я адчувала што будзе так, усё тое, што зроблена за 14 гадоў у адным раёне, знаёмых табе людзей, усё што звязана са шматгадовай

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.104.Л.13-14




Конференция актива района,
Старые Дороги
г.
1979 г.
ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.107.Л.8



-15-

працаваў на адным месцы і нікуды ехаць. І я не памылілася. Аднаўляўся Старадарожскі раён з 1-га жніўня 1966 г. і мяне ў ліку іншых будучых кіраўнікоў раёна накіроўвалі ў Старыя Дарогі як члена аргкамітэта.

Як чалавек дысцыплінаваны, я не змагла адказацца, бо не умела. Пакінула там добраўпарадкаваную кватэру ў цэнтры горада і прыехала на прыватную. Для мяне гэта не было паніжэннем ці як некаторыя казалі выгадным месцам. Проста ў ЦК партыі сказалі: „калі не Вы — дык хто." Усе падкрэслівалі адно: сям'і няма, што Вас стрымлівае, гэта ж з сям'ёй цяжэй пераязджаць! Як прыкра становіцца ў такіх выпадках, калі тыя, хто павінен перш за ўсё улічваць маральны бок, што аднаму чалавеку заўсёды цяжэй... Вось так, думаючы, што часова, а аказалася на ўсё астатняе жыццё я прыехала ў свае Старыя Дарогі, якія сталі маім другім домам.

-16- 9

Сакратар, праз 3-ы гады — другі сакратар райкома партыі. Ізноў рапта круглыя суткі з людскімі лёсамі іх радасцямі і горам. Праблемы аднаўлення працоўных калектываў адпаведна патрабаванням часу; стварэнне, а правільней — аднаўленне раённых арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў. А галоўнае — усяленне ўпэўненасці людзям, што гэта не часовае мерапрыемства, а назаўсёды.

Быў момант, калі хацелася ўсё кінуць і паехаць, куды вочы глядзяць. Але ж я нікуды не змагла паехаць ні тады, калі прапанавалі на 4-ы гады ў Вышэйшую партыйную школу ~~у Ма~~ пры ЦК КПСС у Маскву, ні ў Мінск Рэспубліканскае таварыства „Веды".

У першым выпадку 1-ы сакрат Жураў В.Я. мяне абвініў у „здрадзе," што я іх пакідаю ў самы крытычны момант, калі яшчэ толькі усё пачынае станавіцца на свае месцы — 1968 год. У дру-

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.104.Л..15-16



Встреча с дважды Героем социалистического труда Ралько В.А. на его родине в д. Подоресье
1980 г.
ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.107.Л.9

-17-

ім – 1983 г. – я адмовілася, што не прывыкла і не змагу жыць у вялікім горадзе і мне няма ад каго ўцякаць.

У гэта сапраўды было так. Маральна дзе-б я не была – перажыць мне давялося б самой. Лягчэй гэта там, дзе цябе разумеюць (і ўсё веданнець без тлумачэнняў). Так я пайшла з партыйнай работы на (у 1983 г.) прафсаюзную, віноўнік гэтай бруднай задумы ўцёк у Мінск у навуку.

Дзе б я не працавала – заўсёды верыла у людзей і ім давярала – амаль заўсёды яны мне плацілі тым жа, па крайняй меры – большасць з іх.

Жаданне дапамагчы пачнаму, не даць упасці падаючаму ці дапамагчы падняцца ўпаўшаму заўсёды штурхалі мяне да дзеянняў не давалі спакою.

У сёння я ўдзячна ўсім тым, хто разумеў мяне, падтрымліваў і гэтым дапамагаў мне ў паўсядзённым жыцці і працы.

За 34-ы гады сваёй працы і жыцця у раёне і сёння адчуваю што добрая частка з іх не прайшла бясследна, пэў-

-18- 10

ная памяць аб лепшых гадах майго жыцця ёсць на Старадарожчыне. Ўя ганаруся гэтым, як і тымі людзьмі, што працавалі са мною, і якія лічаць мяне сваёй настаўніцай ці выхавацельніцай. Праз шмат гадоў і сёння рады мы абаходнай сустрэчы. Тут у 1975 г. я сустрэла свой лёс – Шырочэнку Уладзіміра Паўлавіча.

За гады працы ў раёне я пабыла ў цікавых ~~на~~ прыгожых мясцінах былога Савецкага Саюза, Германіі і Польшчы, Венгрыі і Паўночнай Карэі, куды ў большасці выпадкаў накіроўвалі мяне за добрасумленную працу.

За гэта т узнагароджана ордэнам „Знак Пашаны", 3-ма медалямі; ~~2-ма~~ Ганаровай Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Рашэннем райвыканкама ў студзені 2000 г. удастоена звання: „Ганаровы грамадзянін г. Старыя Дарогі".

Е.Кол

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.104.Л..17-18



Колешко Е.И. в составе делегации в Корее
сентябрь 1981 г.
ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.107.Л.10



Группа актива Стародорожского района и шефов Центрального района г. Минска в день праздника «Труда и песни»
1982 г.
ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.107.Л.10



Спыніся, імгненне!

## Памяць у фотаздымку

Колькі б чалавек ні жыў, але пакуль жыве — усё ўспамінае. Адны ўспамінаюць сваю маладосць, другія — цяжкія гады дзяцінства, альбо прыгожае летуценне юнацкіх гадоў.

Але наўрад ці знойдзецца чалавек, які б выкінуў з памяці ліхалецце ваенных дзён, ці змог забыць хутка тых, хто шмат часу ішоў побач у цяжкія дні выпрабаванняў, ці ў часіны радасці.

У кожнага чалавека свае ўспаміны, свае гістарычныя сустрэчы. Вось і гэты здымак таксама пра гістарычную сустрэчу. Яна адбылася 23 гады таму, у лютым 1978 г., калі ў наш раён прыехала група ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, каб разам з актывам раёна прыняць удзел у ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі Старадарожчыны.

Перад выездам у калектывы з удзельнікамі прапагандысцкай групы сустрэліся кіраўнікі раёна, якіх Вы, паважаныя чытачы, бачыце на здымку (**верхні рад злева направа**): Ф.А. Уласік — загадчык РАНА; М.І. Вадап'ян — супрацоўнік рэдакцыі раённай газеты "Поступ Кастрычніка"; п-к у адстаўцы, ветэран вайны П.І. Чаранкоў; 2-гі сакратар РК КПБ А.І. Калешка; загадчык кабінета палітасветы РК КПБ У.С. Шчэрба; падп-к запасу, ветэран ВАВ П.Д. Смульскі; загадчык аддзела прапаганды і агітацыі РК КПБ А.С. Новік; ваенны камісар раёна к-н У.П. Кірычэнка; старшыня РК ДТСААФ, ветэран ВАВ Л.С. Куст; (**ніжні рад злева направа**): п-к ветэран ВАВ В.Р. Сцяпанаў; п-к П.Ц. Клявакін; Герой Савецкага Саюза генерал-маёр у адстаўцы В.Л. Волгін; 1-ы сакратар РК КПБ А.С. Мурашка; старшыня райвыканкама М.П. Бондар; падп-к запасу ветэран ВАВ П.В. Галкін і п-к У.І. Гальперын.

На жаль, асобных з іх ужо няма сярод нас, пайшлі з жыцця назаўсёды, але тое, што яны зрабілі за сваё кароткае жыццё, будзе жыць вечна ў памяці народнай.

І колькі б часу ні мінула, людзі з пакалення ў пакаленне будуць перадаваць лепшыя традыцыі нашага народа.

Успамінаючы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і доўгі час працуючы з імі, так хочацца сказаць вершаванымі радкамі:

Фронтовики! Наденьте ордена!
И вспомним с Вами годы боевые,
Геройские и ратные дела,
И дни, и ночи фронтовые!
Пусть будет мирным небо над землей,
И солнце греет жгучими лучами.
Пусть вновь не слышится снарядов вой,
И дни не кажутся ночами.
Фронтовики! Носите ордена,
С достоинством и гордостью носите!
Геройские традиции храня,
Детей и внуков, правнуков учите!

**А. КАЛЕШКА,**
**жыхарка г. Старыя Дарогі.**
**Фота з сямейнага архіва.**

"Навіны Старадарожчыны" 01.04.2000г.

Газета
«Навины Старадарожчыны»
01.04.2000 года
ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.106.Л.2



Преступления

## Блики войны

Листая в памяти страницы путешествий по местам, где гибли не только солдаты, но и сотни тысяч мирных жителей, да и не только нашей Родины, и посетив в октябре 1974 года фашистский концлагерь "Освенцим" (Краковское воеводство, Польша), на бумагу там же легли эти строки, так как равнодушно смотреть и слушать было нельзя...

Камни Освенцима говорят,
Камни Освенцима оживают,
Если у этих оград стоят
Люди живые, войну вспоминая.
Четыре миллиона погибли здесь.
Стены чужие, умытые кровью.
Они и сегодня трагичную весть
Будят слезою, и болью, и скорбью.
Волос хранящихся семь тонн —
Свидетельство того, что было.
Сегодня также слышен стон —
Земля проклятья не забыла.
Стынут сердце, душа, металл...
Камни Освенцима обвиняют
Тех, кто возмездия избежал,
Кто о новых жертвах мечтает.

**Елена КОЛЕШКО,**
**пенсионерка,**
**жительница г. Старые Дороги.**

„Навіны Старадарожчыны" 15.04.2000 г.

Газета
«Навины Старадарожчыны»
15.04.2000 г.
ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.106.Л.1







УДК 947.67
ББК 63.3(4 Бен)
П 15


РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

А. І. ВАЛАХАНОВІЧ, А. І. ГАЛОТА, Р. І. МАСЛОЎСКІ,
Л. С. ПАРХІМОВІЧ, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

А. І. ГАЛОТА (старшыня), К. І. ДАМАРАД, А. Ф. ДАЎГУЧЫЦ, А. С. ЗАХАРКЕВІЧ,
А. І. КАЛЕШКА (сакратар), В. У. КАРОЛЬКА, Л. В. КУХМАР, А. А. ЛОСІК,
А. А. МІХАЙЛАЎ, Л. С. ПАРХІМОВІЧ, Т. М. САНКЕВІЧ, С. М. ШМАРЛОЎСКІ

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (кіраўнік цэнтра), У. І. ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М. З. БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), С. М. ХОДЗІН (рэдактар)

Укладальнікі:

А. І. ВАЛАХАНОВІЧ, К. І. ДАМАРАД

Мастак Э. Э. ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В. А. РАГАЛЕВІЧА


ISBN 985-06-0251-1



© Выдавецтва «Вышэйшая школа», 1998




24

Почетная
ГРАМОТА

Стародорожский районный исполнительный комитет
НАГРАЖДАЕТ

КОЛЕШКО
Елену Ивановну

за большой личный вклад в создание историко-документальной хроники "Память" Стародорожского района.

Председатель районного
исполнительного
комитета Л.С. ПАРХИМОВИЧ

июль 1999 года
г. Старые Дороги

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.103.Л.24


БЕЛАРУСКАЕ ДОБРААХВОТНАЕ ТАВАРЫСТВА АХОВЫ ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ

4

# ГРАМАТА

*Прэзідыум абласнога (гарадскога) савета таварыства*

**ўзнагароджвае**

КОЛЕШКО
ЕЛЕНУ ИВАНОВНУ –
второго секретаря Стародорожского райкома КПБ.

ЗА УМЕЛОЕ РУКОВОДСТВО РАБОТОЙ РАЙОННОЙ И ПЕРВИЧНЫХ ОРГАНИЗАЦИЙ ОБЩЕСТВА И ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ПАМЯТНИКОВ ИСТОРИИ И КУЛЬТУРЫ В КОММУНИСТИЧЕСКОМ ВОСПИТАНИИ ТРУДЯЩИХСЯ.

прэзідыума Минского (гарадскога) савета таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры А.Е.РАХАНОВ

22 НОЯБРЯ 1977.

Зак. 2967

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.103.Л.4


6

ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

Тав. *Калешка Алена Іванаўна*
*За шматгадовую актыўную работу ў партыйных органах і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння*

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад *19 сакавіка* 19*80* г. узнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР (І. ПАЛЯКОЎ)

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР (Л. ЧАГІНА)

„*19*" *сакавіка* 19*80* г.

№ *4-4169*

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.103.Л.6


10

ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ!

# ПОЧЕТНАЯ ГРАМОТА

НАГРАЖДАЕТСЯ

КОЛЕШКО ЕЛЕНА ИВАНОВНА – за многолетнюю и активную работу в партийных и профсоюзных органах по коммунистическому воспитанию молодежи и в связи с Днем рождения.

Председатель Минского областного комитета профсоюза работников просвещения, высшей школы и научных учреждений Л.Ф.ЛЫКОВА

г.Минск, март, 1985 года

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.103.Л.10



Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

ПОЧЕТНАЯ ГРАМОТА

НАГРАЖДАЕТСЯ

КОЛЕШКО ЕЛЕНА ИВАНОВНА – председатель Стародорожского райкома профсоюза за активную, творческую работу в профсоюзе.

Председатель Минского областного комитета профсоюза работников просвещения, высшей школы и научных учреждений С.Ф.СИМАНЬКОВА

г.Минск, октябрь, 1986 года

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.103.Л.12



20

ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ!

ПОЧЕТНАЯ ГРАМОТА

Стародорожский райком Компартии Белоруссии

НАГРАЖДАЕТ

КОЛЕШКО Елену Ивановну – ответственного секретаря районного совета общества охраны памятников истории и культуры за многолетний добросовестный труд, большую общественную работу и в связи с 60-летием со дня рождения.

Секретарь Стародорожского райкома Компартии Белоруссии А.Гавето

Март 1990 года

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.103.Л.20

СТАРАДАРОЖСКІ
РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ
КАМІТЭТ

СТАРОДОРОЖСКИЙ
РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ
КОМИТЕТ

27.01.2000. **Протокол № 02 заседания**

г. Старые Дороги.

Председательствовал Пархимович Л.С.

Присутствовали: первый заместитель председателя исполкома Усик В.П., заместители: Михайлов А.А., Петрушеня Т.И.

Управляющий делами исполкома Королько В.В.

Члены исполкома: Бода М.Т., Кукуть П.П., Кухмар Л.В., Малолеткин В.Е.

Приглашенные по соответствующим вопросам начальники управлений, заведующие отделами, руководители районных организаций (список прилагается).

24. СЛУШАЛИ: О присвоении звания "Почетный гражданин города Старые дороги" Колешко Елене Ивановне.

РЕШИЛИ: 1. За многолетний, добросовестный труд, заслуги в социально-экономическом развитии города и района присвоить звание "Почетный гражданин города Старые дороги" бывшему второму секретарю Стародорожского районного комитета коммунистической партии Беларусиии Колешко Елене Ивановне.

2. Финансовому отделу райисполкома (Кухмар Л.В.) выделить бюджетные средства в размере 10 (десяти) минимальных заработных плат для вручения Колешко Е.И.

Председатель исполкома Л.С.Пархимович
Управляющий делами исполкома В.В.Королько

ЗГА Слц.Ф.267.Оп.5.Д.157.Л.6,13

26

# Почетная ГРАМОТА

**Стародорожский районный исполнительный комитет**

**НАГРАЖДАЕТ**

**КОЛЕШКО Елену Ивановну**

***Почетного гражданина г. Старые Дороги, за многолетний, добросовестный, плодотворный труд в партийных и советских органах, активное участие в социально-экономическом развитии района и в связи с 70-летием со дня рождения.***

*Председатель исполкома* *Л.С. Пархимович*

*г. Старые Дороги*
*март 2000 г.*

ЗГА Слц.Ф.805.Оп.1.Д.103.Л.26

**Так же Колешко Елена Ивановна в 1970 году была награждена юбилейной медалью «За доблестный труд в ознаменование 100-летия со дня рождения В.И.Ленина,»;**
**в 1971 году была награждена медалью «За трудовое отличие»;**
**в 1976 году был вручен орден «Знак почета»;**
**В 1985 году была награждена медалью «Ветеран труда».**

Виртуальная выставка подготовлена на основе архивных документов
Зонального государственного архива в г. Слуцке
отделом использования и публикации документов
в рамках года белорусской женщины

***БЛАГОДАРИМ ЗА ВНИМАНИЕ!***

*2026* год

*г. Слуцк*